BÓBEK



Education and Science

# «НАУКА И ОБРАЗОВАНИЕ В СОВРЕМЕННОМ МИРЕ: ВЫЗОВЫ XXI века»

**VI Международная научно-практическая конференция**



АПРЕЛЬ 2020 ГОД
НУР-СУЛТАН (АСТАНА),
КАЗАХСТАН

**Объединение юридических лиц в форме ассоциации**
**«Общенациональное движение «Бобек»**
**КОНГРЕСС УЧЕНЫХ КАЗАХСТАНА**

# «SCIENCE AND EDUCATION IN THE MODERN WORLD: CHALLENGES OF THE XXI CENTURY»

атты VI Халықаралық ғылыми-тәжірибелік конференция

**ЖИНАҒЫ**

# МАТЕРИАЛЫ

VI Международной научно-практической конференции

# «НАУКА И ОБРАЗОВАНИЕ В СОВРЕМЕННОМ МИРЕ: ВЫЗОВЫ XXI века»

## СЕКЦИЯ 11. ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ НАУКИ

## III ТОМ

**НУР-СУЛТАН – 2020**

**УДК 378 (063)**
**ББК 74.58**
**С 940**

**ГЛАВНЫЙ РЕДАКТОР:**
**Ж. Мәлибек профессор, З.Е. Кабульдинов д.и.н. профессор,**
**Ж. Калиев к.п.н.; Маслов Х.Б., PhD;**
**Заместители главного редактора:**
**Е. Ешім, Е. Абиев (Казахстан), Лю Дэмин (Китай),**
**Е.Л. Стычева, Т.Г. Борисов (Россия)**

**С 940**

«SCIENCE AND EDUCATION IN THE MODERN WORLD: CHALLENGES OF THE XXI CENTURY» материалы VI Международной науч-прак. конф. (ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ НАУКИ)/ сост.: Е. Ешім, Е. Абиев – Нур-Султан, 2020 – 107с.

ISBN 978-601-332-721-1

**«SCIENCE AND EDUCATION IN THE MODERN WORLD: CHALLENGES OF THE XXI CENTURY»** атты VI Халықаралық ғылыми-тәжірибелік конференция материалдары жинағына Қазақстан, Ресей, Қытай, Түркия, Беларусь, Украина, Молдова, Қырғызстан, Өзбекстан, Тәжікстан, Түрікменстан, Грузия, Монғолия жоғары оқу орындары мен ғылыми мекемелердің қызметкерлері мен ұстаздары, магистранттары, студенттері және мектеп мұғалімдерінің баяндамалары енгізілді. Жинақтың материалдары жоғары оқу орнындары мен ғылыми мекемелердегі қызметкерлерге, оқытушыларға, мектеп және колледж мұғалімдеріне, магистранттар мен студенттерге арналған.

VI Международная научно-практическая конференция **«НАУКА И ОБРАЗОВАНИЕ В СОВРЕМЕННОМ МИРЕ: ВЫЗОВЫ XXI века»**, включают доклады ученых, студентов, магистрантов и учителей школ из разных стран (Казахстан, Россия, Китай, Турция, Беларусь, Украина, Кыргызстан, Узбекистан, Таджикистан, Молдавия, Туркменистан, Грузия, Монголия). Материалы сборника будут интересны научным сотрудникам, преподавателям, учителям средних школ, колледжей, магистрантам, студентам учебных и научных учреждений.

**УДК 378 (063)**
**ББК 74.58**

ISBN 978-601-332-721-1

**© ОЮЛ в форме ассоциации**
**«Общенациональное движение «Бобек», 2020**

3. Бугакова, Е.В. Творческое саморазвитие старшеклассника в креативном образовании: монография / Е.В. Бугакова. – Оренбург: Типография «Экспресс-Печать», 2013. – 160с.
4. Вентцель, К.Н. Сборник избранных трудов / К.Н. Вентцель. – М: Прогресс, 1993.-364 с.

**УДК 373.31**

## РЭАЛІЗАЦЫЯ ТЭХНАЛОГІІ НАВУЧАННЯ Ў СУПРАЦОЎНІЦТВЕ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ НА І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

**Шылава Алена Савельеўна**
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі БДПУ ім. М. Танка,
Мінск, Рэспубліка Беларусь

**Мурашка Наталля Уладзіміраўна**
Магістрант БДПУ ім. М. Танка,
Мінск, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – А. С. Шылава

**Анатацыя:** праблема актывізацыі пазнавальнай дзейнасці кожнага вучня на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі выклікае неабходнасць пошуку і ўкаранення новых падыходаў, інтэнсіўных адукацыйных тэхналогій, якія спрыяюць эфектыўнаму правядзенню адукацыйнага працэсу, трываламу засваенню ведаў і забяспечваюць дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці.

**Ключевыя словы**: актывізацыі пазнавальнай дзейнасці, тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве, памылка, маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя.

Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве з'яўляецца альтэрнатыўнай традыцыйнаму навучанню малодшых школьнікаў на аснове атрымання гатовых ведаў і іх узнаўлення; дае магчымасць актывізаваць пазнавальную дзейнасць кожнага вучня ў адукацыйным працэсе.

Галоўная ідэя навучання ў супрацоўніцтве заключаецца ў тым, што малодшыя школьнікі вучацца разам, навучаючы і дапамагаючы адзін аднаму, а не проста адначасова выконваюць прапанаванае настаўнікам заданне. Каб усвядоміць гэтую ідэю, мэтазгодна звярнуцца да разумення слова «памылка».

Памылка, дапушчаная пры выкананні заданняў на ўроках – гэта няправільнасць у выкананні якой-небудзь працы.

Настаўнікі пачатковых класаў за любую дапушчаную памылку ў заданні павінны зніжаць адзнаку. А калі ў вучня шмат памылак, то часцей за ўсё гэта расцэньваецца як няздольнасць дзіця або яго нежаданне працаваць. Л. В. Занкоў, размаўляючы з настаўнікамі пачатковых класаў і бацькамі вучняў, неаднаразова падкрэсліваў, што памылка, дапушчаная дзіцём пры самастойным выкананні задання ў класе або дома, гэта сігнал настаўніку і бацькам, што ён не разумее, што яму патрэбна дапамога. Ён не дазваляў выкарыстоўваць чарнавікі, а казаў, што ўсё, што піша вучань у сшытку – гэта яго думкі, яго веды, яго разуменне або неразуменне. А ўсе яго выпраўленні, цяжкасці і памылкі бацькі і настаўнік павінны бачыць і ведаць.

Адной з важных праблем пры вывучэнні беларускай мовы і літаратурнага чытання з'яўляецца фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі. У межах яе фарміравання перад настаўнікам пастаўлены наступныя задачы [1, 2]: фарміраванне камунікатыўных уменняў і навыкаў навучэнцаў; развіццё практычных уменняў і навыкаў выкарыстання беларускай мовы ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці; развіццё творчых здольнасцей навучэнцаў пры стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў; а таксама развіццё вобразнага ўяўлення, развіццё маўленчай актыўнасці, развіццё здольнасці да літаратурнай творчасці на падставе ўспрынятых твораў мастацкай літаратуры.

Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве прадугледжвае розныя варыянты, маючы пры гэтым шырокія магчымасці навучання малодшых школьнікаў: «Навучанне ў камандзе » (Student Team Learning – STL); «Піла» (Jigsaw), «Вучымся разам» (Learning Together) [3; 4].

У дадзеным артыкуле мы разгледзім варыянт магчымасці выкарыстання тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве, які мае назву **«Навучанне ў камандзе» на ўроках белорускай мовы і літаратурнага чытання.**

Этапы (або алгарытм) рэалізацыі варыянту «**Навучанне ў камандзе**» можна прадставіць наступным чынам:

1) настаўнік тлумачыць вучням новы матэрыял або заданне;

2) настаўнік размяркоўвае вучняў на групы па 4 чалавекі;

3) кожная група атрымлівае аднолькавыя заданні, якія арыентаваны на разуменне, запамінанне і замацаванне новага навучальнага матэрыялу, г.зн. арганізуецца праца па фарміраванні асновы дзеянняў для кожнага вучня;

4) кожны вучань у групе самастойна выконвае адно з прапанаваных заданняў;

5) усе выкананыя заданні ў групе тлумачацца ўслых кожным вучнем па чарзе (мэтазгодна пачынаць тлумачэнне з больш моцнага вучня), астатнія ўдзельнікі групы кантралююць тлумачэнне таго, хто выступае;

6) калі ў каго-небудзь з удзельнікаў групы ў выкананні задання ўзнікалі цяжкасці або былі дапушчаны памылкі, астатнія дзеці прыходзяць ім на дапамогу: спрабуюць высветліць прычыну дапушчанай памылкі, тлумачаць вывучаны матэрыял і патрабуюць ад іх паўторнага тлумачэння выконваемых дзеянняў;

7) кожная група прадстаўляе вынікі сваёй працы.

Так на ўроках беларускай мовы мы прапануем выкарыстоўваць гэты вырыянт тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве **на** розных **этапах урока**: актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў, вывучэння новага матэрыялу, замацавання вывучанага матэрыялу.

Як прыклад, разгледзім варыянт «**Навучанне ў камандзе**» на ўроку беларускай мовы ў 1 класе на этапе **вывучэння новага матэрыялу** пры вывучэнні тэмы «Я і мая школа. Вучэбныя рэчы» [1].

**Першы этап**. Настаўнік паказвае прадмет, вучні называюць яго па-рускі, а настаўнік па-беларуску: сшытак, падручнік, пенал, ручка, аловак, фламастар, гумка, ранец. Калі вучні ведаюць назвы прадметаў па-беларуску, то трэба дазволіць ім выказацца. Затым настаўнік яшчэ раз паказвае гэтыя ж прадметы, а вучні хорам называюць па-беларуску і кладуць іх перад сабой. Пасля гэтага настаўнік арганізуе парную працу вучняў, якія сядзяць за адной партай, па завучванні беларускіх слоў.

Вучань, які сядзіць на першым варыянце паказвае прадметы, якія ляжаць перад ім, а вучань, які сядзіць на другім варыянце называе гэтыя прадметы па-беларуску. Затым вучні мяняцца ролямі.

**Другі этап.** Настаўнік размяркоўвае вучняў на групы па 4 чалавекі.

**Трэці этап.** Настаўнік прысвойвае вучням групы нумары 1, 2, 3, 4.

**Чацвёрты этап.** Настаўнік размяркоўвае, хто з вучняў якое заданне будзе выконваць: вучні пад нумарам 1 – павінны знайсці і назваць такія прадметы, назвы якіх у рускай і беларускай мовах падобны; вучні пад нумарам 2 – павінны знайсці і назваць такія прадметы, назвы якіх у рускай і беларускай мовах адрозніваюцца; вучні пад нумарам 3 – павінны назваць усе гэтыя прадметы адным словам; вучні пад нумарам 4 – павінны знайсці і назваць такія прадметы, у назве якога сустракаецца гук [г] [5, с. 18]. Вучні самастойна выконваюць заданні.

**Пяты этап.** Кожны ўдзельнік групы па чарзе спачатку паўтарае сваё заданне, потым дае свой адказ на заданне, а астатнія вучні кантралююць адказ вучня, які выступае. Праца ў групе: паўтарэнне заданні, адказ, адбываецца наступным чынам: 1→ 2 → 3 → 4 → 1.

**Шосты этап.** Праца над дапушчанымі памылкамі.

*Трэба загадзя падрыхтаваць вучняў да таго, што ўсе удзельнікі групы могуць задаваць пытанні вучню, які адказвае, па яго матэрыялу. Калі вучань, які адказвае, адчувае цяжкасці пры адказе на пытанне, удзельнікі групы прыходзяць яму на дапамогу.*

**Сёмы этап.** Кожная група прадстаўляе вынікі сваёй працы. Для эканоміі навучальнага часу, дадзены этап можна правесці таксама франтальна. Для гэтага настаўнік просіць падняць уверх прадметы-адказы на пытанне вучняў пад нумарам 1 і дае магчымасць самім вучням знайсці памылкі ў сябе або сваіх сяброў і выправіць іх, растлумачыць чаму на іх думку вучні з суседняй групы дапусцілі памылку. Затым па аналогіі свае адказы паказваюць вучні пад нумарам 2, 3, 4.

Разгледзім яшчэ адзін варыянт «**Навучанне ў камандзе**», які можна выкарыстоўваць на ўроках літаратурнага чытання ў межах **пазакласнага чытання,** напрыклад**, у 2 класе па тэме «*Мы ў адказе за тых, каго прыручылі*»** [2].

На папярэднім уроку пазакласнага чытання дзецям было дадзена заданне знайсці і прачытаць творы ў адпаведнасці са спіскам [2]: Я. Брыль «Жыў-быў вожык»; А. Бутэвіч «Цікаўная котка»; П.Кавалёў «Жыві сабе, зайчык»; Я. Пархута «Снегавічок»; Ю. Свірка «Ласіны стажок», «Сняжок»; А. Ставер «Матылёк»; П. Ткачоў «Шэрая курачка», «Ласяня»; М. Янчанка «Бярозка».

**Першы этап.** Настаўнік праводзіць выставу кніг, якія трэба было прычатаць. Ён знаёміць дзяцей з кнігамі, размаўляе з дзецьмі пра аўтараў, паказвае вокладкі і ілюстрацыі. Затым настаўнік паказвае вучням карцінкі (вожыка, зайчыка, ласяня, снегавіка, кошкі), а дзеці угадавают з якіх яны твораў. Пасля гэтага дзецям прапануецца папрацаваць у камандзе.

**Другі этап.** Настаўнік размяркоўвае вучняў на групы па 4 чалавекі.

**Трэці этап.** Настаўнік прысвойвае вучням групы нумары 1, 2, 3, 4.

У настаўніка падрыхтаваны канверты, на якіх напісаны лічбы 1, 2, 3, 4 (мал.1). Колькасць канвертаў павінна адпавядаць колькасці дзяцей у класе, а колькасць канвертаў з аднолькавым нумарам павінна адпавядаць колькасці груп.

**ал юн ак 1. – Ка**




**нверты, падрыхтаваныя для працы**

У кожным канверце ляжыць ліст з чатырма невялікімі заданнямі для аднаго вучня.

*Сутнасць задання ў канверце – гэта падрыхтоўка кожным вучнем вуснага паведамлення пра адзін з твораў, які яны чыталі дома. Але, паколькі вучні 2 класа павінны яшчэ навучыцца рыхтаваць свой вусны адказ, то мы ў канверт ўкладваем своеасаблівы план падрыхтоўкі вуснага паведамлення, які, па сутнасці, складаецца з 4 задач: здагадацца пра які твор ідзе гаворка і назваць яго, назваць аўтара гэтага твора, падрыхтаваць невялікі расказ пра яго, прачытаць маленькі адрывак з яго.*

*Ніжэй прыведзены прыклад аднаго з заданняў. (У дужках пазначаны правільныя адказы для настаўнікаў.)*

***Заданне для канверта под нумерам 1:***

1) Выпраўце назву твора: «Цікаўная мушка». *(«Цікаўная котка».);*
2) Назавіце аўтара твора. *(А. Бутэвіч.);*
3) Падрыхтуйце 2-3 сказы пра гэты твор;
4) Прычытайце цікавы маленькі ўрывак з яго.

Настаўнік размяркоўвае канверты па камандах (для адной каманды па адным канверце кожнага нумара).

**Чацвёрты этап.** Вучні самастойна выконваюць заданні. На яго выкананне адводзіцца пэўны час.

**Пяты і шосты этапы**. Кожны ўдзельнік групы па чарзе спачатку паўтарае сваё заданне, а потым дае свой адказ, а астатнія вучні яго кантралююць. Калі вучань адчувае цяжкасці ў выкананні задання, удзельнікі групы прыходзяць яму на дапамогу.

**Сёмы этап.** Кожная група прадстаўляе вынікі сваёй працы.

Пасля выступлення ўсіх груп можна з класам выбраць групу, якая лепш за ўсіх падрыхтавалась, ці групу, у адказах якой было менш за ўсіх моўных памылак, альбо групу, у якой быў найбольш поўны адказ.

Выкарыстанне «***Навучання ў камандзе***» на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання дазваляе настаўніку праверыць гатоўнасць да ўроку кожнага вучня, дае магчымасць творча сябе праявіць. Акрамя таго, ствараецца сітуацыя поспеху для кожнага вучня і ў дзяцей з'яўляецца матывацыя да чытання кніг.

Выкарыстанне варыянту «***Навучання ў камандзе***» тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве фарміруе камунікатыўныя ўменні, развівае навыкі зносін, актывізуе мысліцельную і маўленчую дзейнасць, што ў выніку спрыяе фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў вучняў; дапамагае настаўніку зрабіць працэс абагульнення існуючых ведаў больш эфектыўным, і стварыць ўмовы для развіцця маўленчай дзейнасці кожнага вучня. Акрамя таго, праца па дадзенай тэхналогіі развівае навыкі зносін і камунікацыі, што ў выніку спрыяе фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў вучняў.

## СПІС ВЫКАРАСТАНЫХ КРЫНІЦ:

1. Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания: 1 класс / Министерство образования Республики Беларусь. – Минск : Нац. ин-т образования, 2017. – 139 с.
2. Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания: 2 класс / Министерство образования Республики Беларусь. – Минск : Нац. ин-т образования, 2017. – 195 с.
3. Полат, Е. С. Личностно ориентированные технологии обучения // Новые педагогические информационные технологии в системе образования : учеб. пособие для студ. пед. вузов и системы повыш. квалиф. пед. кадров / Е. С. Полат, М. Ю. Бухаркина, М. В. Моисеева, А. Е. Петров; под ред. Е. С. Полат. – М. : Изд центр «Академия», 2000. – С. 203-247.